ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ГІСТОРЫЯ*
### *HISTORY*

УДК 94:001.89:005.71:001.32(476)
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2018-63-4-434-446

Паступіў у рэдакцыю 07.09.2018
Received 07.09.2018

**В. В. Даніловіч, В. Л. Лакіза**

*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ: ДАСЯГНЕННІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

**Аннотация.** Рассматриваются важнейшие результаты деятельности за последние годы Института истории НАН Беларуси – ведущей научной организации в области фундаментальных и прикладных исследований по отечественной и всеобщей истории, археологии и антропологии, в том числе организации и осуществлению мероприятий по изучению и сохранению историко-культурного и археологического наследия страны, его практическому использованию и популяризации. В год празднования 90-летия со дня основания НАН Беларуси в структуре Института работает пять центров: археологии и древней истории Беларуси (отделы: археологии первобытного общества; археологии Средних веков и Нового времени; сохранения и использования археологического наследия; истории Беларуси Средних веков и раннего Нового времени); Новой и Новейшей истории Беларуси (отделы: истории Беларуси Нового времени; военной истории Беларуси; Новейшей истории Беларуси); специальных исторических наук и антропологии (отделы: генеалогии, геральдики и нумизматики; источниковедения и археографии; историографии и методов исторического исследования; антропологии); всеобщей истории и международных отношений; истории геополитики. При Институте действуют Археологическая научно-музейная экспозиция, Центральный научный архив НАН Беларуси (включает единственный в стране Фонд археологической научной документации), Международная школа историко-археологических исследований.

Внимание акцентируется на достижениях учёных в рамках выполнения заданий подпрограммы «История и культура» Государственной программы научных исследований «Экономика и гуманитарное развитие белорусского общества» на 2016–2020 годы, а также представлены результаты, которые попали в ТОП-10 достижений НАН Беларуси, важнейшие публикации, научно-практические мероприятия, перспективы развития научных исследований.

**Ключевые слова:** Институт истории НАН Беларуси, история Беларуси, археология, антропология, всеобщая история, подпрограмма "История и культура", важнейшие результаты, ТОП-10 достижений НАН Беларуси, историко-культурное наследие, подготовка кадров высшей квалификации

**Для цитирования:** Даніловіч, В. В. Інстытут гісторыі НАН Беларусі: дасягненні і перспектывы / В. В. Даніловіч, В. Л. Лакіза // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2018. – Т. 63, № 4. – С. 434–446. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2018-63-4-434-446

**V. V. Danilovich, V. L. Lakiza**

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

# INSTITUTE OF HISTORY OF THE NATIONAL ACADEMY OF SCIENCES OF BELARUS: ACHIEVEMENTS AND PROSPECTS

**Abstract.** The article presents the major accomplishments of the Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus in recent years – the leading scientific organization in the field of fundamental and applied research on national and universal history, archaeology and anthropology, including organization and implementation of activities to study and preserve the historical, cultural and archaeological heritage of the country, practical application and popularization.

In the year of the 90th anniversary of the National Academy of Sciences of Belarus the Institute incorporates 5 centers: the Center of Archaeology and Ancient History of Belarus (including departments of archaeology of primitive society, archaeology of the Middle Ages and Modern times, the department of preservation and using of archaeological heritage, the department of history of Belarus in the Middle Ages and early Modern times); the Center of Modern and Contemporary History of Belarus (including departments of history of Belarus in modern times, the military history of Belarus, the department

© Даніловіч В. В., Лакіза В. Л., 2018

of the newest history of Belarus); the Center of History and Anthropology Related Sciences (including departments of genealogy, heraldry and numismatics, the department of source studies and archeography, the departments of historiography and methods of historical research, anthropology); the Center of General History and International Relations; the Center for History of Geopolitics.

The Institute has an Archaeological Scientific and Museum Exposition, the Central Scientific Archive of NAS of Belarus (including the only one in the country Fund of archaeological research documents) and the International School of Historical and Archaeological Research.

The article focuses on the achievements of scientists in the framework of fulfilling the tasks of the subprogram "History and Culture" of the state research program "Economics and Humanitarian Development of the Belarusian Society" for 2016–2020, as well as the results that were included in the TOP 10 achievements of the National Academy of Sciences of Belarus, important publications, scientific and practical events, prospects for the development of scientific research.

**Keywords:** The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, the history of Belarus, archaeology, anthropology, the general history, the subprogram "History and Culture", the major accomplishments, the Top 10 achievements of the National Academy of Sciences of Belarus, the historical and cultural heritage, and training of scholars and scientists with advanced degrees

**For citation:** Danilovich V. V., Lakiza V. L. Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus: Achievements and Prospects. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series*, 2018, vol. 63, no. 4, pp. 434–446 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2018-63-4-434-446

Інстытут быў заснаваны 15 кастрычніка 1929 г. у г. Мінску на базе кафедраў і камісій гістарычнага профілю Інстытута беларускай культуры як інстытут гістарычных навук, пасля чаго 10 сакавіка 1931 г. быў перайменаваны ў Інстытут гісторыі. У год святкавання 90-годдзя з дня заснавання НАН Беларусі ў Інстытуце працуюць пяць цэнтраў: археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі (аддзелы: археалогіі першабытнага грамадства; археалогіі Сярэднявечча і Новага часу; захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны; гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і ранняга Новага часу); Новай і Навейшай гісторыі Беларусі (аддзелы: гісторыі Беларусі Новага часу; ваеннай гісторыі Беларусі; Навейшай гісторыі Беларусі); спецыяльных гістарычных навук і антрапалогіі (аддзелы: генеалогіі, геральдыкі і нумізматыкі; крыніцазнаўства і археаграфіі; гістарыяграфіі і метадаў гістарычнага даследавання; антрапалогіі); усеагульнай гісторыі і міжнародных адносін; гісторыі геапалітыкі. Пры інстытуце дзейнічаюць Археалагічная навукова-музейная экспазіцыя, Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (уключае адзіны ў краіне Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі), а таксама кластар "Міжнародная школа гісторыка-археалагічных даследаванняў" [18; 21; 39].

На сучасным этапе Інстытут гісторыі НАН Беларусі з'яўляецца вядучай навуковай установай краіны ў сферы гістарычнай навукі, дзе ажыццяўляюцца фундаментальныя і прыкладныя навуковыя даследаванні па айчыннай і ўсеагульнай гісторыі, археалогіі, антрапалогіі, у тым ліку арганізацыя і правядзенне мерапрыемстваў па вывучэнні і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама яе практычным выкарыстанні і папулярызацыі. Адна з важнейшых задач айчынных гісторыкаў – аб'ектыўны паказ мінулага і фарміраванне гістарычнай свядомасці беларускага народа як комплексу асэнсаваных ведаў і ўяўленняў аб гісторыі, традыцыях і культуры сваіх продкаў.

Вучоныя Інстытута гісторыі паспяхова выконваюць падпраграму «Гісторыя і культура» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг., а таксама асобныя навукова-даследчыя праекты. Пры гэтым Інстытут з'яўляецца першай галаўной арганізацыяй, а цэнтры і аддзелы інстытута выступаюць каардынуючымі цэнтрамі даследаванняў па адпаведных напрамках для ўсёй нашай краіны [21; 29; 30; 39].

У інстытуце сёння працуе 121 супрацоўнік: 13 дактароў і 57 кандыдатаў навук, з іх 1 акадэмік, 1 член-карэспандэнт, 9 прафесараў і 30 дацэнтаў. Яны актыўна фарміруюць і ўмацоўваюць уласныя навуковыя школы, перадаюць вопыт і веды маладым даследчыкам [21].

Даследаванні вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі, многія вынікі якіх не маюць аналагаў у айчыннай і замежнай гістарычнай навуцы, ажыццяўляюцца на аснове шырокага комплексу археалагічных матэрыялаў і архіўных дакументальных крыніц, у адпаведнасці з прынцыпам гістарызму і нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіяй Рэспублікі Беларусь, фарміруюць уласна бела-

рускі погляд на гісторыю Беларусі і гістарычны светапогляд беларускага народа, садзейнічаюць умацаванню беларускай дзяржаўнасці.

У сціслых рамках артыкула прадставіць усе важнейшыя распрацоўкі і дасягненні вучоных інстытута нават за апошнія гады вельмі складана. Таму сканцэнтруем увагу на 2016-м г., па выніках якога Інстытут гісторыі НАН Беларусі быў занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару пераможцаў спаборніцтва, 2017-м г. – Годзе навукі, а таксама першай палове 2018-га г. – Годзе малой радзімы.

За гэты час у рамках выканання заданняў дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў вывучаны дзясяткі археалагічных аб’ектаў па ўсёй краіне, уведзены ў навуковы ўжытак сотні раней невядомых дакументальных крыніц, што дазволіла не толькі значна пашырыць тэматычныя сюжэты навуковых даследаванняў, але і ўдакладніць ранейшыя звесткі і ўяўленні па шматлікіх праблемах гісторыі, археалогіі і антрапалогіі.

Археолагі інстытута ў выніку даследаванняў ва ўсіх абласцях Беларусі выявілі новыя археалагічныя артэфакты, якія сведчаць аб высокай матэрыяльнай і духоўнай культуры насельніцтва Падняпроўя, Панямоння, Паазер’я, Падзвіння, Палесся, Пабужжа ў палеаліце, мезаліце, неаліце, бронзавым і жалезным вяках, Сярэднявеччы і Новым часе. Комплексна даследаваны пытанні першапачатковага асваення і засялення тэрыторыі Беларусі ў першабытны перыяд; славянская праблематыка; асаблівасці фарміравання раннедзяржаўных структур і развіцця гарадоў.

Ажыццяўляліся планавыя, ахоўныя і падводныя археалагічныя даследаванні, археалагічная экспертыза і абследаванне тэрыторый новабудоўляў, назіранні за ходам будаўнічых работ у ахоўных зонах аб’ектаў археалогіі, маніторынг стану гісторыка-культурных аб’ектаў і распрацоўка праектаў іх зон аховы.

Так, М. М. Крывальцэвічам грунтоўна даследаваны старажытнасці сярэднедняпроўскай культуры ў Падняпроўі, а А. Ю. Ткачоў выявіў рэдкія фрагменты посуду культуры шнуравой керамікі на паселішчы Камянюкі ў Белавежскай пушчы, А. Ф. Касюк на славянскім паселішчы Снядзін Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці атрымала серыю матэрыялаў для прыродазнаўчых аналізаў сумесна з партнёрамі з Гётынгенскага ўніверсітэта (Германія). В. М. Ляўко даследавала ўнікальны для Усходняй Еўропы комплекс эпохі вікінгаў VIII–X стст. Кардон Шумілінскага раёна, які на 200 гадоў старажытнейшы за шырокавядомае Гнёздава пад Смаленскам. Матэрыялы комплексу даказваюць удзел варагаў у развіцці гандлёва-эканамічнага патэнцыялу рэгіёна, раскрываюць яго шырокія міжнародныя сувязі і вядучую ролю ў фарміраванні дняпроўска-ловацкага адрэзка шляху “з вараг у грэкі” на ранняй стадыі (IX – сярэдзіна X ст.) стварэння дзяржаўных структур ва ўсходніх славян *(ТОП-10 дасягненняў вучоных НАН Беларусі за 2016 г.)* [1, с. 63–105; 27; 28].

Упершыню каля в. Баруны Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці Я. В. Уласавец адкрыў і даследаваў грунтовы могільнік другой паловы XIII–XIV ст. Сярод унікальных артэфактаў – мячы, дзіды, баявыя сякеры, элементы даспехаў і рыштунку вершнікаў, упрыгожванні з каляровага металу, а таксама рэдкая сякера, інкруставаная срэбрам. М. В. Клімаў каля в. Кульнёва Расонскага раёна Віцебскай вобласці лакалізаваў дакладнае месцазнаходжанне крэпасці Сокал XVI ст. і ў выніку яе раскопак выявіў унікальныя артэфакты: касцяны крыж, медны кацёл, рэшткі зброі і амуніцыі, манеты і інш. В. І. Кошман абгрунтаваў надзвычайную важнасць Барысаўскага мікрарэгіёна ў палітычных, эканамічных і гандлёвых адносінах як у перыяд Старажытнай Русі, так і ВКЛ, даказаў, што ў XIV ст. адбыўся перанос палітычнай і сацыяльнай актыўнасці з “першапачатковага” Барысава ў раён сучаснага Барысава, дзе быў узведзены Барысаўскі замак на левым беразе р. Бярэзіны.

Сапраўднае адкрыццё зроблена Г. М. Бяліцкай у Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласці на славянскім паселішчы каля в. Бярэжцы, могільніку каля в. Малы Малешаў, а таксама на паселішчы каля в. Яськавічы Салігорскага раёна Мінскай вобласці. Ёю выяўлены самыя старажытныя на сённяшні дзень славянскія матэрыялы, якія датуюцца IV ст. і сведчаць, што славяне з’явіліся на тэрыторыі Беларусі на 200 гадоў раней, чым лічылася да гэтага. У выніку істотна змяніліся ўяўленні пра ўмовы ўзнікнення першай славянскай пражскай культуры, якая склалася ў першай палове I тысячагоддзя н. э. на аснове познезарубінецкіх старажытнасцей у Беларускім Палессі. За

гэта адкрыццё Г. М. Бяліцкая разам з Э. А. Ляшкевіч і А. Ф. Касюк атрымалі дыплом пераможцаў конкурсу *ТОП-10 дасягненняў вучоных НАН Беларусі за 2017 г.* [2, с. 95–98].

Макс. М. Чарняўскі выявіў унікальныя касцяныя і бурштынавыя артэфакты паўночна-беларускай культуры на паселішчы Асавец 2 Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці, у прыватнасці, унікальны зааморфны амулет у форме галавы вужа, жалейку з трубчастай косткі птушкі. У выніку створана найбольшая на тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы калекцыя духавых музычных інструментаў III – першай паловы II тысячагоддзя да н. э.

У курганным могільніку каля в. Бацвінава Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці пад кіраўніцтвам Г. Р. Цімафеенка быў даследаваны радзімічскі курган X–XII стст. і выяўлена ўпускное пахаванне без суправаджальнага інвентару з добра захаваным касцяком мужчыны ва ўзросце каля 45 гадоў. Антраполагамі інстытута адноўлена вонкавае аблічча старажытнага жыхара Гомельшчыны.

У рамках рэалізацыі падводных даследаванняў археалагічных аб’ектаў на тэрыторыі Беларусі ўдасканалены методыкі працы пад вадой ва ўмовах абмежаванай бачнасці. Важнае навуковае значэнне і шырокі грамадскі рэзананс набылі падводныя даследаванні Замка Жабер у Драгічынскім раёне (С. Б. Ліневіч сумесна з А. С. Ліхачовым і дайвінг-цэнтрам “Марскі Пегас”), а таксама сумесныя даследаванні з аддзелам падводных археалагічных даследаванняў Свабоднага ўніверсітэта Бруселя пад кіраўніцтвам Крыстафа Дэлаэра ў в. Студзёнка Барысаўскага раёна (В. І. Кошман).

На падставе дагавора аб супрацоўніцтве з Інстытутам Лауэ-Ланжэвена (L’Institut Laue-Langevin / ILL) (Грэнобль, Францыя) на базе ILL і SIMaP і Цэнтрам напалеонаўскіх даследаванняў (Парыж, Францыя) праведзены комплексныя даследаванні (рэнтгенаўская і нейтронная тамаграфія, нейтронная радыяграфія) артэфактаў старажытнарускага перыяду і 1812 г., якія атрыманы беларуска-французскай археалагічнай экспедыцыяй на месцы пераправы арміі Напалеона праз р. Беразіну каля в. Студзёнка ў канцы лістапада 1812 г. (В. І. Кошман).

Актыўна праводзіліся навуковыя даследаванні ў зонах новабудоўляў [25] па заказах: дзяржаўнага прадпрыемства “Белдзіпрадар” у зонах будаўніцтва і рэканструкцыі аўтамабільных дарог (абходы г. п. Мір і г. Ваўкавыска) (В. Л. Лакіза); замежнага таварыства з абмежаванай адказнасцю “Славкалий” на тэрыторыі будаўніцтва Нежынскага горна-абагачальнага комплексу ў Любанскім раёне (С. Б. Ліневіч); камунальнага ўнітарнага прадпрыемства “Мінская Спадчына” на тэрыторыі Мінска (А. М. Мядзведзеў, С. Д. Дзярновіч); а таксама ў Брэсце, Гродне, Віцебску, Нясвіжы, Пінску, Оршы, Навагрудку, Копысі, іншых абласных і раённых цэнтрах краіны (В. М. Ляўко, П. Ф. Лысенка, Н. М. Дубіцкая, А. В. Вайцяховіч, І. У. Ганецкая, П. М. Кенька). Упершыню праведзены археалагічныя работы на тэрыторыі ўрочышча Благаўшчына (комплекс лагера Малы Трасцянец) – месцы масавага знішчэння нямецка-фашысцкімі акупантамі дэпартаванага яўрэйскага насельніцтва з краін Заходняй Еўропы і савецкіх грамадзян у перыяд мая 1942 г. – снежня 1943 г. (В. І. Кошман). У выніку ахоўных даследаванняў адкрыты дзясяткі новых аб’ектаў археалогіі, асобных месцазнаходжанняў старажытных артэфактаў, ажыццёўлены меры па іх вывучэнні і захаванні.

Інстытутам гісторыі НАН Беларусі сумесна з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, абласнымі выканаўчымі камітэтамі і Мінскім гарвыканкамам, іншымі зацікаўленымі ў 2017–2018 гг. праведзена значная работа па ўдасканаленні аховы археалагічных аб’ектаў. У прыватнасці, 27 чэрвеня 2017 г. на рабочай нарадзе па праблеме ўдасканалення аховы археалагічных аб’ектаў і археалагічных артэфактаў з удзелам Першага намесніка Кіраўніка адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь М. У. Рыжанкова, Старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь І. А. Марзалюка, намесніка Міністра ўнутраных спраў М. А. Мельчанка, намесніка Міністра культуры А. А. Яцко, намесніка Старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта М. А. Свірыда, намесніка начальніка Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь А. А. Дунькoвіча былі абмеркаваны пытанні выбудоўвання сістэмы дзейсных мер па выяўленні і спыненні незаконнага пошуку археалагічных артэфактаў, а таксама абароту археалагічных артэфактаў і прыцягненню да адказнасці асоб, якія ажыццяўляюць незаконную дзейнасць. У 2017 г. археолагамі інстытута праведзены семінары па пытаннях удасканалення аховы археалагічных аб’ектаў

і артэфактаў для спецыялістаў аддзелаў ідэалогіі, культуры і па справах моладзі, архітэктуры і землеўпарадкавальных службаў у Магілёўскім, Мінскім, Гомельскім, Гродзенскім аблвыканкамах. Спецыяльныя даклады па пытаннях аховы археалагічнай спадчыны і заканадаўства ў гэтай сферы былі агучаны вучонымі Інстытута гісторыі на прадстаўнічых навукова-практычных канферэнцыях у Слуцку, Свіслачы, Карэлічах, Любані і інш. [26].

Антраполагі інстытута пад кіраўніцтвам В. У. Марфінай на аснове археалагічных матэрыялаў ажыццявілі пластычную рэканструкцыю аблічча жыхароў мястэчка Рагачоў XVII–XVIII стст. Рэканструяваныя выявы з дапамогай фотамантажу сумяшчаліся з этнаграфічнымі фотаздымкамі. Такі падыход дазволіў спалучыць рэальнае вонкавае аблічча чалавека і лакальныя этнаграфічныя асаблівасці касцюма. Створаны камп'ютарныя базы даных, якія змяшчаюць асноўныя паказчыкі фізічнага развіцця абследаваных у розныя гады студэнтаў беларускіх ВНУ [4].

У год святкавання 500-годдзя кнігадрукавання шмат увагі надавалася пошукам новых крыніц, каб праліць святло на невядомыя і спрэчныя старонкі з жыцця і дзейнасці беларускага першадрукара Ф. Скарыны і яго сям'і. Знойдзены дакументы, якія дазволілі ўдакладніць час паступлення Ф. Скарыны ў Кракаўскі ўніверсітэт: канец сакавіка – пачатак красавіка 1505 г., а не 1504 г., як лічылася раней. Выяўлены два раней невядомыя дакументы Семяона Скарыны, сына Ф. Скарыны, адзін з якіх з'яўляецца аўтографам з яго ўласнаручным подпісам. Знойдзены таксама аўтограф і асабістая пячатка беларускага гуманіста Васіля Цяпінскага (А. А. Жлутка, Я. Д. Сурскі) [2, с. 98–99; 30].

Упершыню ўведзены ў навуковы ўжытак новыя сфрагістычныя і геральдычныя матэрыялы па мяшчанскай і шляхецкай геральдыцы ВКЛ канца XV–XVI ст., выяўленыя ў фондах архіваў, музеяў і бібліятэк Беларусі і Літвы. Яны дазволілі зняць існаваўшыя праблемы па ідэнтыфікацыі пэўных асоб, якім прыпісваліся партнёрскія сувязі з Ф. Скарынам. Устаноўлена, што Ф. Скарына меў уласны герб і мяшчанскі «гербік», якія адлюстроўвалі яго спецыфічны сацыяльны і прававы статус набілітаванага ў Свяшчэннай Рымскай імперыі мешчаніна. Выяўлена яшчэ адна аўтарская гравюра Ф. Скарыны, падпісаная манаграмай «AWE», з новым партрэтам самога Ф. Скарыны і яго найбольш блізкіх паплечнікаў. Вызначана кола памочнікаў першадрукара, пры гэтым з іх ліку канчаткова выключаны прадстаўнікі родаў Калантаяў і Жабаў. Даказана, што «Біблія Руская» друкавалася ў прыватнай пражскай друкарні Севярынаў (А. І. Шаланда) [36].

Выяўлены ўнікальныя крыніцы па сацыяльна-эканамічнай гісторыі Мінска XVIII ст.: інвентары замкавай, мітрапаліцкай, радзівілаўскай, сапегаўскай юрыдык Мінска, устаноўлены факт наяўнасці ў Мінску элементаў каменных абарончых умацаванняў у першай палове XVIII ст. (даказана існаванне ў 1742 г. старой каменнай Юр'еўскай брамы). Выяўлены арыгіналы прывілеяў мястэчку Жыровічы 1654 і 1748 гг. (А. Б. Доўнар) [30].

Выкарыстанне прасапаграфічнага метаду падчас даследавання працэсу адаптацыі навучэнцаў рымска-каталіцкіх навучальных устаноў да эканамічнай і сацыяльна-прававой прасторы Расійскай імперыі дазволіла скласці 885 біяграм навучэнцаў і на іх аснове вывесці тыповы партрэт навучэнца Мінскай рымска-каталіцкай духоўнай семінарыі (Р. У. Зянюк) [19]. Выяўлены імёны ўраджэнак Беларусі, якія ў XIX ст. атрымалі вышэйшую адукацыю на жаночых курсах у Санкт-Пецярбургу і Маскве, вучыліся ў замежных універсітэтах, а таксама былі ўдастоены ў іх вучоных ступеняў і званняў (І. Р. Чыкалава) [2, с. 105].

В. В. Даніловічам комплексна прааналізаваны ўдзел моладзі Савецкай Беларусі ў грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных і духоўна-культурных працэсах у 1921–1939 гг., вызначаны яго характэрныя асаблівасці. Даказана, што моладзь была не толькі аб'ектам палітыкі, але і рэальнай дзеючай сілай у справе будаўніцтва новай грамадска-палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і духоўна-культурнай сістэмы. А. П. Салаўянавым даследавана арганізацыя сацыяльнай абароны непаўналетніх у першыя гады савецкай улады, а таксама развіццё сеткі дзіцячых устаноў Беларусі ў 1991–2005 гг.

Калектывам вучоных пад кіраўніцтвам А. А. Кавалені і А. М. Літвіна ўпершыню раскрыты пытанні ўдзелу беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі ў найважнейшых падзеях Вялікай Айчыннай вайны, якія характарызуюць агульны вялікі ўклад насельніцтва рэспублікі ў Перамогу [12].

М. У. Смяховічам упершыню распрацавана канцэпцыя гісторыі развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі ў перыяд з восені 1943 г. па 1991 г. з вызначэннем і характарыстыкай этапаў і асаблівасцей. Выяўлена, што ўкараненне гаспадарчага разліку ў калгасах і саўгасах не прывяло да вырашэння харчовай праблемы. У выніку ў савецкім грамадстве нарасталі супярэчнасці паміж калгасным сялянствам, працоўнымі саўгасаў і кіруючай элітай савецкай дзяржавы [34].

Упершыню ўведзены ў навуковы ўжытак архіўныя крыніцы па пытаннях міжнароднага супрацоўніцтва Беларусі па пераадоленні наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Вызначаны этапы фарміравання пазіцыі міжнародных структур сістэмы ААН, такіх як МАГАТЭ, Навуковы камітэт па дзеянні атамнай радыяцыі, Сусветная арганізацыя аховы здароўя ў дачыненні да аварыі на Чарнобыльскай АЭС і ацэнак яе радыялагічных наступстваў (К. А. Крывічаніна). Выяўлены асаблівасці гандлёва-эканамічных адносін Беларусі і Казахстана ў 1991–2016 гг. (А. А. Александровіч) [2, с. 105].

Штогод у Інстытуце гісторыі выконваюцца каля 20 асобных навуковых праектаў, якія фінансуюцца НАН Беларусі і БРФФД. У выніку даследаваны пытанні станаўлення і развіцця фінансавай сістэмы Беларусі; выяўлены характэрныя асаблівасці тапаграфіі першабытных стаянак Бердыж і Юравічы; выдзелены лакальныя варыянты мясцовых супольнасцей прыпяцка-нёманскай і нёманскай культур у перыяд неаліту; упершыню сістэматызаваны і прааналізаваны комплекс археалагічных, нумізматычных, пісьмовых, іканаграфічных матэрыялаў сярэдзіны XIII–XV ст. з тэрыторыі Усходняй Еўропы, у тым ліку Беларусі, якія звязаны з кантактамі мясцовага насельніцтва і качавых народаў Вялікага стэпу эпохі мангольскіх уплываў; устаноўлена, што ў XVIII – пачатку XX ст. франкамоўная культура выконвала ролю пасрэдніка паміж беларускімі землямі і заходнееўрапейскай цывілізацыяй, садзейнічала абмену ідэямі, культурнымі практыкамі, ведамі, матэрыяльнымі аб’ектамі; сфарміраваны агульны комплекс матэрыялаў, які дазваляе цэласна вывучаць гістарычныя перадумовы і агульны кірунак развіцця двухбаковых кантактаў Рэспублікі Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікі ў рамках рэалізацыі канцэпцыі «Новага шаўковага шляху»; раскрыты асаблівасці развіцця беларуска-кітайскіх адносін на працягу 1921–2017 гг. [2, с. 114–116].

У Інстытуце гісторыі мэтанакіравана вядзецца праца па падрыхтоўцы навуковых кадраў. У аспірантуры і дактарантуры інстытута ажыццяўляецца падрыхтоўка па спецыяльнасцях 07.00.02 – айчынная гісторыя; 7.00.06 – археалогія; 07.00.07 – этнаграфія, этналогія, антрапалогія; 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання; 03.03.02 – антрапалогія. У 2017 г. у аспірантуры навучалася 19 чалавек (вочнай формы навучання – 12, завочнай – 6, саіскальнік – 1), з якіх 11 маладых спецыялістаў для ўласных патрэб. Колькасць дактарантаў у 2017 г. склала 18 чалавек (вочнай формы навучання – 4, саіскальнікаў – 14, 1 з іх рыхтуецца платна для гістарычнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава). Вучоным саветам Інстытута гісторыі зацверджаны базавыя патрабаванні да вынікаў навукова-даследчай дзейнасці аспірантаў і дактарантаў, якія служаць ключавым крытэрыем пры іх атэстацыі. Шэраг аспірантаў і дактарантаў інстытута сталі лаўрэатамі стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і грантаў НАН Беларусі на навукова-даследчую працу.

У інстытуце створаны неабходныя ўмовы для прадукцыйнага функцыянавання савета па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый Д 01.40.01 па спецыяльнасцях 07.00.02 – айчынная гісторыя; 7.00.06 – археалогія; 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычных даследаванняў (старшыня савета – А. А. Каваленя; вучоны сакратар – В. Л. Лакіза), што спрыяе інтэнсіўнай падрыхтоўцы навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі як для інстытута, так і для патрэб іншых устаноў Беларусі і замежных краін. Так, на працягу 2011–2017 гг. савет прыняў да абароны 71 дысертацыю (11 доктарскіх і 60 кандыдацкіх), з якіх паспяхова абаронены 68 (10 доктарскіх і 58 кандыдацкіх): 4 доктарскія і 50 кандыдацкіх – па айчыннай гісторыі; 2 доктарскія і 6 кандыдацкіх – па археалогіі; 4 доктарскія і 4 кандыдацкія – па гістарыяграфіі, крыніцазнаўству і метадах гістарычных даследаванняў. Адзначым, што ў 2016 г. вучоныя і аспіранты інстытута абаранілі 3 кандыдацкія і 1 доктарскую дысертацыі, у 2017 г. – 5 кандыдацкіх і ў пачатку 2018 г. – 2 кандыдацкія дысертацыі.

Арыгінальныя навуковыя творы археолагаў, гісторыкаў і антраполагаў інстытута раскрываюць найбагацейшы гісторыка-культурны і духоўны пласт беларускага народа. Шматлікія выданні, падрыхтаваныя навукоўцамі Інстытута гісторыі, з'яўляюцца гонарам Рэспублікі Беларусь, шырока запатрабаваны ў навукова-адукацыйным працэсе, атрымалі прызнанне шырокай айчыннай і замежнай грамадскасці, не маюць аналагаў у свеце.

Вылучаюцца такія выданні, як: выдадзеная ў новай серыі «Славянские древности Беларуси» калектыўная фундаментальная праца «Славяне на территории Беларуси в догосударственный период» у 2 кнігах, у якой на падставе тэарэтычных распрацовак і абагульнення назапашанага археалагічнага матэрыялу раскрываюцца асаблівасці і праблемныя пытанні этнагенезу славян, асваення імі тэрыторыі нашай краіны [31; 32], а таксама трэці том "Вялікага гістарычнага атласа Беларусі" [16].

Толькі за 2017 г. супрацоўнікамі інстытута былі апублікаваны 40 кніжных выданняў (4 за межамі Беларусі), сярод якіх 17 манаграфій (4 за межамі краіны), 7 зборнікаў навуковых артыкулаў і 2 зборнікі матэрыялаў канферэнцый, 3 падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, 1 зборнік дакументаў і матэрыялаў, 6 навукова-папулярных кніг, 1 навукова-інфармацыйнае выданне на англійскай мове. Акрамя таго, атрыманыя вынікі даследаванняў знайшлі адлюстраванне ў 324 навуковых артыкулах (з іх 67 за межамі Беларусі), 40 тэзісах (з іх 24 за межамі краіны) і 44 навукова-папулярных публікацыях [5; 19; 23; 24; 33].

Асобна адзначым знакавыя для айчыннай гістарычнай навукі зборнікі навуковых артыкулаў *"Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура": у 2 частках*; *"Беларусь в геополитических процессах XX–XXI вв."* [14; 15].

Беларускімі антраполагамі падрыхтавана ўнікальнае выданне *"Антропология Беларуси в исследованиях конца XIX – середины XX в."*. У ім прадстаўлены найбольш значныя працы, напісаныя беларускімі і замежнымі даследчыкамі ў канцы XIX – сярэдзіне XX ст., у якіх адлюстраваны пачатковы этап развіцця антрапалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі. У выніку раскрыты раней невядомыя старонкі з гісторыі развіцця антрапалогіі ў Беларусі, сабраны біяграфічныя звесткі пра жыццё і дзейнасць даследчыкаў [4].

У калектыўнай манаграфіі *"История аграрной науки Беларуси (XIX–XXI вв.)"*, якая выйшла ў 2 частках, упершыню сістэмна даследаваны працэс развіцця аграрнай навукі Беларусі ў XIX–XXI стст., вызначаны яго перыяды і этапы, а таксама іх характэрныя асаблівасці, раскрыты і асветлены напрацоўкі і дасягненні айчынных вучоных-аграрыяў [20].

Важнае дзяржаўнае значэнне маюць выданні, падрыхтаваныя вучонымі інстытута сумесна з Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь *"Актуальные направления идеологической работы в Республике Беларусь"* [3] і *"Белорусский путь развития (вопросы и ответы)"* [11]. У іх прадстаўлены асноўныя напрамкі арганізацыі і вядзення ідэалагічнай працы ў Рэспубліцы Беларусь, змешчана актуальная інфармацыя як тэарэтычнага, так і практычнага характару аб палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і духоўнай сферах жыццядзейнасці беларускага грамадства.

Выдадзены шэраг грунтоўных манаграфічных даследаванняў па актуальных праблемах археалогіі, айчыннай і ўсеагульнай гісторыі перыядаў Сярэднявечча і Новага часу. Так, у манаграфіі М. А. Волкава *"Слуцк на старых планах"* з асновай на багаты архіўны матэрыял адлюстравана гісторыя аднаго з найбольш самабытных гарадоў Беларусі [13]. Падставай для вывучэння шматграннай і яскравай мінуўшчыны Слуцка сталі планы горада і яго частак XVII – пачатку XX ст. Большасць з іх выяўлены ў архівах Беларусі, Польшчы, Германіі, Расіі, Літвы і апублікаваны ўпершыню. У манаграфіі В. М. Бароўскай *"Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918–1921 гг."* праведзена сістэмнае даследаванне гісторыі савецка-польскіх перагавораў 1918–1921 гг., вызначана перыядызацыя перагаворнага працэсу, разгледжана пытанне фарміравання беларускага ўчастка савецка-польскай мяжы [5]. У манаграфіі І. Р. Чыкалавай *"Великобритания: изучение в Российской империи (XIX – начало XX в.)"* раскрыты асноўныя напрамкі вывучэння Вялікабрытаніі ў Расійскай імперыі, вернуты ў культурную прастору і навуковы ўжытак шматлікія працы, апублікаваныя на працягу XIX – пачатку XX ст., выяўлены расійскія англазнаўцы – выхадцы з беларускіх губерняў, прааналізавана роля перыядычнага друку ў азнаямленні чытача Расійскай імперыі з жыццём брытанскага грамадства [35].

Вельмі важна, што непасрэдныя фундаментальныя распрацоўкі вучоных інстытута знайшлі адлюстраванне ў падрыхтаваным навучальным дапаможніку для агульнаадукацыйных школ *“Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст.”*, у якім адлюстраваны і адаптаваны да ўспрымання вучнямі сярэдняга школьнага ўзросту самыя важныя падзеі і працэсы, якія адбываліся ў айчыннай гісторыі на працягу аднаго з найскладаных перыядаў [17].

Асаблівае значэнне мае міжнародны праект з расійскім Фондам садзейнічання актуальным гістарычным даследаванням “Историческая память”, які распачаўся ў 2017 г. і вынікам якога ўжо стала выданне ў Расійскай Федэрацыі манаграфій М. М. Смальянінава, А. А. Крыварота і Д. А. Крывашэя, прысвечаных падзеям Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войн на тэрыторыі Беларусі [23; 24; 33].

Адзначым калектыўную манаграфію і зборнік дакументаў у 3 тамах і 6 кнігах «Страна в огне», прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Над гэтым праектам працавалі нашы гісторыкі сумесна з расійскімі вучонымі амаль дзесяць гадоў (выданне атрымала нацыянальную прэмію Расіі «Лучшие книги и издательства года» ў намінацыі «Гісторыя»).

Добра ілюстраваная кніга «Беларусь: страницы истории» ўпершыню ў гісторыі была выдадзена ў 2016 г. на кітайскай мове ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы, а ў 2018 г. адноўлены варыянт гэтай навукова-папулярнай кнігі выдадзены і на англійскай мове [40].

У 2018 г. таксама пабачыла свет калектыўная манаграфія *«Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг.»*, дзе ўпершыню комплексна аналізуецца грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў перыяд знаходжання ў складзе Расійскай імперыі, паказваюцца эвалюцыя дзяржаўна-прававога статусу беларуска-літоўскіх зямель, адносіны тагачаснага беларускага грамадства да палітыкі ўлад, працэсы станаўлення і кансалідацыі грамадскіх і нацыянальных рухаў [37]; калектыўная манаграфія *«Беларуская Народная Рэспубліка – крок да незалежнасці: да 100-годдзя абвяшчэння»*, у якой адлюстраваны складаны і супярэчлівы працэс афармлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці [38], а таксама грунтоўная абагульняючая манаграфія А. Г. Калечыц *«Чалавек і асяроддзе: каменны век, Заходняе Палессе»*, у якой на новым узроўні раскрыты пытанні першапачатковага асваення людзьмі прастораў Беларусі ў палеаліце і мезаліце, матэрыяльнай і духоўнай культуры старажытных насельнікаў нашай краіны [22].

Інстытут гісторыі актыўна арганізуе і штогод праводзіць звыш дваццаці навуковых мерапрыемстваў (канферэнцый, семінараў, “круглых сталоў”) не толькі ў Мінску, але і ў розных рэгіёнах Рэспублікі Беларусь з мэтай шырокай папулярызацыі найноўшых даследаванняў вучоных па рэгіянальнай гісторыі. Такія мерапрыемствы накіраваны на выхаванне гістарычнай самасвядомасці і патрыятызму, любові да роднага краю, развіцця рэгіянальнага і міжнароднага турызму. На іх абмяркоўваюцца пытанні аховы і практычнага выкарыстання археалагічнай і гісторыка-культурнай спадчыны; гісторыі беларускай дзяржаўнасці; падзей Вялікай Айчыннай вайны. У працы канферэнцый прымаюць удзел не толькі вучоныя, але і настаўнікі, навучэнцы, музейныя работнікі, краязнаўцы. Такая форма навукова-асветнай работы атрымала шырокі грамадскі рэзананс і высокую ацэнку навуковай супольнасці [2, с. 110–114; 29; 30].

Нельга не адзначыць праведзеныя сумесна з Брэсцкімі абласным і гарадскім выканаўчымі камітэтамі, Брэсцкім дзяржаўным універсітэтам імя А. С. Пушкіна, Мемарыяльным комплексам «Брэсцкая крэпасць-герой», Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь і Ваеннай акадэміяй Рэспублікі Беларусь Міжнародную навуковую канферэнцыю *«Беларусь у агні 1941 года (да 75-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны)» (Брэст, 21–22 чэрвеня 2016 г.)*; сумесна з гістарычнымі факультэтамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка Міжнародную навуковую канферэнцыю *«Метадалогія даследавання гісторыі Беларусі: праблемы, дасягненні, перспектывы» (Мінск, 20–21 кастрычніка 2016 г.)*; а таксама Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю *«Post Mortem. Погребальные памятники в историко-культурном пространстве: проблемы изучения и сохранения» (Мінск, 9–11 лістапада 2016 г.),* Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «*Древности III–I тыс. до н. э. Беларуси и смежных территорий: новые взгляды и интерпретации (к 80-летию изучения поселений Кривинского торфяника)» (Мінск, 1–2 снежня 2016 г.)*, Міжнародную навуковую канферэнцыю да 100-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі *“Вялікі Кастрычнік у гістарычных лёсах беларускай дзяржаўнасці” (Мінск,*

*2–3 лістапада 2017 г.),* Міжнародную навуковую канферэнцыю да 100-годдзя БНР *«Беларуская Народная Рэспубліка ў гісторыі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці» (Мінск, 15–16 сакавіка 2018 г.).*

Важнае значэнне меў Першы сімпозіум *"Навуковыя асновы беларускай дзяржаўнасці"*, праведзены 28 сакавіка 2017 г. На ім была абмеркавана канцэпцыя гісторыі беларускай дзяржаўнасці і прынята рашэнне пра падрыхтоўку шматтомнага выдання па гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Рэзанансной падзеяй у справе развіцця і папулярызацыі айчынных геапалітычных даследаванняў з'явілася праведзеная 30–31 сакавіка 2017 г. Міжнародная канферэнцыя *"Беларусь у сучасных геапалітычных працэсах"*, арганізаваная сумесна з германскім Фондам імя К. Адэнаўэра. Знакавым мерапрыемствам у справе пашырэння беларускага погляду на гісторыю Вялікага Княства Літоўскага стала Міжнародная навуковая канферэнцыя *"Парламентарызм у Вялікім Княстве Літоўскім у XVIII стагоддзі: інстытуты, парламентарыі, парламенцкая практыка"*, праведзеная сумесна з Літоўскім універсітэтам эдукалогіі 10 мая 2017 г. у Вільнюсе. Значны навуковы і грамадскі рэзананс атрымала Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя *«Антрапалогія сям'і: гістарычныя, сацыяльна-эканамічныя і біялагічныя аспекты даследаванняў»*, якая адбылася 28–30 чэрвеня 2017 г. Канферэнцыя была падтрымана Міждзяржаўным фондам гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў-удзельніц СНД і праводзілася ў Год сям'і, які быў абвешчаны ў краінах СНД. Шырокі водгук як у навуковых колах, так і ў сродках масавай інфармацыі атрымала Міжнародная навуковая канферэнцыя *"Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 950-годдзя горада)"*, якая была праведзена сумесна з Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам 7–8 верасня 2017 г. У Слуцку і Мінску 22–23 верасня 2017 г. была праведзена Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «*Беларусь, Слуцкі край і Эдвард Вайніловіч (да 170-годдзя з дня нараджэння)»*, у якой удзельнічалі прадстаўнікі Рымска-каталіцкага касцёла і Праваслаўнай царквы, работнікі культурна-асветных устаноў, педагогі і навучэнцы [10].

Сумесна з выдавецкім домам "Беларуская навука" Інстытутам гісторыі НАН Беларусі заснаваны і ўжо некалькі гадоў выдаюцца кнігі ў серыі "Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі" [7–9]. Гэтыя арыгінальныя навуковыя творы раскрываюць найбагацейшыя гісторыка-культурныя і духоўныя пласты беларускага народа.

К Году малой радзімы ў 2018 г. разам з мясцовымі ўладамі ўжо праведзены канферэнцыі *"Расонскі край: гісторыя, культура, людзі (да 100-годдзя з дня нараджэння П. М. Машэрава)", "Шклоў і яго наваколлі ў гісторыі Беларусі", "Хатынь и её сёстры: трагедия и память (к 75-летию Хатынской трагедии)", "Ашмяншчына – штодзённае жыццё жыхароў краю X–XX стст.", "Гісторыка-культурная спадчына Дзятлаўшчыны (да 520-годдзя горада)"* і *"Беларусь, Клецкі край і Эдвард Вайніловіч".*

Падчас падрыхтоўкі рэгіянальных навуковых мерапрыемстваў узнімаецца значны пласт раней невядомых архіўных дакументаў і матэрыялаў, а таксама праводзяцца адмысловыя археалагічны даследаванні. Напрыклад, у 2018 г. акрамя сенсацыйных адкрыццяў на ўскраіне старажытнага Мінска (С. Д. Дзярновіч) і Новага замка Гродна (І. У. Спірын, А. У. Касцюкевіч) новыя артэфакты розных гістарычных перыядаў выяўлены на першабытных стаянках каля в. Пархуты Дзятлаўскага раёна (В. Л. Лакіза) і в. Барава Іўеўскага раёна (С. С. Велент-Шчэрбач); раннеславянскім паселішчы каля Давыд-Гарадка на Беларускім Палессі (Г. М. Бяліцкая), археалагічным комплексе Кардон Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці (С. Д. Дзярновіч), рэштках дома дружынніка X ст. каля Гальшан (П. М. Кенька, Я. В. Уласавец) і палаца Святаполк-Мірскіх каля Мірскага замка (І. У. Ганецкая), старажытных тэрыторыях Слоніма (А. М. Максімовіч) і Барысава (В. І. Кошман).

Важна, што сумесна з мясцовымі раённымі выканаўчымі камітэтамі і аддзеламі адукацыі рэгулярна арганізуюцца археалагічныя летнікі. Школьнікі вучацца методыцы археалагічных даследаванняў, фіксацыі выяўленых артэфактаў, зачыстцы аб'ектаў. Толькі ў апошнія гады такія экспедыцыі працавалі на помніках Ашмянскага, Дзятлаўскага, Зэльвенскага, Іўеўскага, Карэліцкага, Лагойскага, Лоеўскага, Рэчыцкага, Рагачоўскага, Свіслацкага, Старадарожскага, а таксама шэрага іншых раёнаў краіны.

Вучоныя інстытута накіраваны на практычнае выкарыстанне вынікаў сваіх даследаванняў. Яны ўдзельнічаюць у распрацоўцы арыгінальных навуковых канцэпцый музеяў, экспазіцый і выстаў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, музея гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мірскага замка, Музея гісторыі Мінска, Мінскай гарадской ратушы, а таксама шэрага

краязнаўчых музеяў (Брэст, Камянюкі, Ляскавічы, Моталь, Іўе, Свіслач, Рагачоў, Рэчыца і інш.). Напрыклад, самыя ўнікальныя археалагічныя артэфакты былі прадстаўлены дэлегатам ІІ З'езда вучоных Рэспублікі Беларусь (12–13 снежня 2017 г.). У Мірскім замку праходзілі арганізаваная сумесна з партнёрамі са Швецыі Міжнародная выстава *"Ultima ratio regum. Беларусь у Паўночных войнах сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст."* (вясна – восень 2017 г.) і выстава *"Феадальная рэзідэнцыя ў святле археалагічных даследаванняў"*, адкрыццё якой 24 мая 2018 г. было прымеркавана да Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі *"Вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі ў 2017 годзе"*. На аснове напрацовак археолагаў інстытута ствараецца першы ў краіне археалагічны музей пад адкрытым небам на тэрыторыі Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» каля в. Камянюкі (сумесная праца Інстытута гісторыі НАН Беларусі, НП «Белавежская пушча», праектнай арганізацыі «Брэстрэстаўрацыяпраект»). Узведзена гарадзішча жалезнага веку з абарончымі валамі, драўлянай вежай і мостам цераз роў з вадой, жылымі і гаспадарчымі пабудовамі розных археалагічных культур Беларусі [2, с. 118–119].

Праводзілася актыўная і мэтанакіраваная праца па папулярызацыі археалагічнай і гісторыка-культурнай спадчыны краіны ў СМІ. Вучоныя Інстытута гісторыі неаднаразова выступалі на каналах Беларусь-1, АНТ, СТБ, РТР-Беларусь, Беларусь-24, Мінск-ТБ, у інтэрнэт-рэсурсах і на радыё, а таксама ў перыядычным друку («СБ-Беларусь сегодня», «Рэспубліка», «Народная газета», «Мінскі кур'ер», «Гродзенская праўда»).

Зроблена шмат. Але калектыў інстытута не спыняецца на дасягнутым, даследаванні па антрапалогіі, археалогіі, айчыннай і сусветнай гісторыі рухаюцца ў зададзеным кірунку, які адпавядае нацыянальным і дзяржаўным інтарэсам Рэспублікі Беларусь. На гэтым шляху нам яшчэ неабходна вырашыць цэлы шэраг актуальных задач.

Для паспяховага вывучэння археалагічнай спадчыны краіны, з мэтай мінімізацыі выдаткаў пры праектаванні і будаўніцтве народнагаспадарчых аб'ектаў, зберажэння культурнай спадчыны беларускага народа, арганізацыі эфектыўнай аховы помнікаў археалогіі актуальным і запатрабаваным з'яўляецца стварэнне "Археалагічнай карты Беларусі" на падставе суцэльнага абследавання ўсёй тэрыторыі краіны і нанясення на карты ўсіх вядомых помнікаў археалогіі, іх зон аховы. Для фінансавання важнейшых археалагічных экспедыцый, у тым ліку на развіццё спецыяльных метадаў, набыццё пэўнага абсталявання для археалагічных пошукаў і аналізаў, варта праводзіць адмысловыя конкурсы Міністэрствам культуры НАН Беларусі, НАН Беларусі, аблвыканкамамі і Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам. Значна больш у краіне павінна быць і археолагаў, а таксама вузкіх спецыялістаў, звязаных з прыродазнаўчымі даследаваннямі старажытнасцей.

Безумоўна, самай сур'ёзнай увагі патрабуюць праблемы крыніцазнаўства. Вельмі актуальным з'яўляецца стварэнне трывалых асноў для маштабнай навукова-даследчай і арганізацыйнай работы па планамерным і сістэматычным выданні гістарычных дакументаў. У гэтай сувязі прапрацоўваюцца варыянты рэалізацыі праграмы выдання крыніц па айчыннай гісторыі з адпаведным фінансаваннем, магчыма, праз Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь.

У лік крыніц для першачарговай публікацыі павінны ўвайсці старажытныя дакументы, што пралiваюць святло на гісторыю Беларусі XIII – пачатку XVI ст., а таксама шматлікія земскія, гарадскія і магістрацкія кнігі з беларускіх зямель XVI–XVIII стст., якія захоўваюць у сабе велізарны матэрыял па сацыяльнай, эканамічнай, палітычнай гісторыі нашай айчыны, дзейнасці цэнтральных і мясцовых органаў улады і кіравання, гістарычнай геаграфіі, генеалогіі баярскіх, мяшчанскіх і нават сялянскіх родаў. Неабходна прадоўжыць працу па выданні кніг Метрыкі ВКЛ, звесткі якіх маюць неацэннае значэнне для гісторыі Беларусі. На рэгулярную і сістэматычную аснову павінна быць пастаўлена справа па выданні крыніц па новай і навейшай гісторыі Беларусі.

Разам з калегамі з ВНУ плануецца падрыхтоўка шматтомнай гісторыі Беларусі, дзе на аснове новых канцэптуальных і метадалагічных распрацовак гістарычнай навукі, а таксама нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіі Рэспублікі Беларусь будуць абагульнены важнейшыя працэсы і падзеі айчыннай гісторыі, сучасныя дасягненні нашай краіны. Гэта шматтомная праца будзе своеасаблівай нарматыўнай базай пры падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для навучальных устаноў, навуковым "компасам" пры далейшай распрацоўцы недаследаваных або малавывучаных праблем гісторыі Беларусі.

Будзе працягвацца праца па выкананні такіх знакавых выдавецкіх праектаў, як "Древнейшие города Беларуси", "Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі", "Антропология Беларуси".

Увогуле плануецца падрыхтоўка і выданне комплексу фундаментальных аб'ектыўных навуковых работ па нацыянальнай гісторыі, якія сфарміруюць навуковую базу для ўдасканалення і аднаўлення праграм, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для вышэйшых, сярэдніх і сярэднеспецыяльных навучальных устаноў, будуць спрыяць развіццю ў падрастаючага пакалення і грамадства ў цэлым разумення багацця беларускай гісторыі і культуры, пачуццяў патрыятызму і гонару за свой народ і краіну.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Акадэмічная гуманітарыстыка: важнейшыя вынікі 2016 года / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў; А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – 188 с.

2. Акадэмічная гуманітарыстыка: важнейшыя вынікі 2017 года / А. А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Аддз. гуманітар. навук і мастацтваў. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – 207 с.

3. Актуальные направления идеологической работы в Республике Беларусь / М. Г. Жилинский [и др.]; редкол.: М. Г. Жилинский [и др.]. – Минск: Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь, 2017. – 331 с.

4. Антропология Беларуси в исследованиях конца XIX – середины XX в. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; сост.: О. В. Марфина, Н. Н. Помазанов, В. А. Шипилло, В. С. Крумплевский; авт. ист. коммент. В. В. Яновская; науч. ред.: И. И. Саливон, О. В. Марфина. – Минск: Беларуская навука, 2017. – 456 с.

5. Бароўская, В. М. Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918–1921 гг. / В. М. Бароўская. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – 269 с.

6. Беларусь в геополитических процессах XX–XXI вв.: сб. науч. ст. / редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларуская навука, 2017. – 191 с.

7. Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Браслаўскія чытанні: (да 950-годдзя горада Браслава): зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; навук. рэд. В. М. Ляўко; рэдкал.: В. В. Даніловіч [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2016. – 271 с.

8. Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Калінкавічы і Калінкавіцкі край: зб. навук. арт. / уклад.: А. А. Скеп'ян, рэдкал.: В. В. Даніловіч [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2016. – 325 с.

9. Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Шумілінскі край: зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; рэдкал.: В. В. Даніловіч [і інш.]; навук. рэд. В. М. Ляўко. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – 263 с.

10. Беларусь, Слуцкі край і Эдвард Вайніловіч: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. / рэдкалегія: А. А. Каваленя (навуковы рэдактар) [і інш.]. – Мінск: Медысонт, 2018. – 416 с.

11. Белорусский путь развития (вопросы и ответы): справ. / М. Г. Жилинский [и др.]; под общ. ред. М. Г. Жилинского. – Минск: Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь, 2017. – 184 с.

12. Вклад белорусского народа в Победу в Великой Отечественной войне /А. М. Литвин [и др.]; редкол. А. А. Коваленя (науч. ред.) [и др.]. – Минск: Беларуская навука, 2016.

13. Волкаў, М. А. Слуцк на старых планах / М. А. Волкаў; навук. рэд. Д. В. Лісейчыкаў. – Мінск: Беларусь, 2017. – 159 с.

14. Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура: зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; уклад.: А. А. Скеп'ян; рэдкал.: У. Р. Гусакоў [і інш. ]. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – Т. 1. – 506 с.

15. Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура: зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; уклад.: А. А. Скеп'ян; рэдкал.: У. Р. Гусакоў [і інш. ]. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – Т. 2. – 498 с.

16. Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 4 т. / рэдкал.: Г. І. Кузняцоў (старшыня) [і інш.]. – Мінск: Белкартаграфія, 2016. – Т. 3. – 352 с.

17. Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст.: навук. дапам. для 7-га кл. устаноў агульн. сярэдн. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. А. Варонін, А. А. Скеп'ян, А. У. Мацук, В. В. Краўчанка; пад рэд. В. А. Вароніна, А. А. Скеп'ян. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2017. – 214 с.

18. Данилович, В. В. Институт истории / В. В. Данилович, В. Л. Лакиза // Национальная академия наук Беларуси: энцикл. справ. / Нац. акад. наук Беларуси, Изд. дом «Беларуская навука»; редкол.: В. Г. Гусаков (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларуская навука, 2017. – С. 189–193.

19. Зянюк, Р. У. Навучальныя ўстановы рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі (1772–1914 гг.) / Р. У. Зянюк. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – 300 с.

20. История аграрной науки Беларуси (XIX–XXI вв.) / В. Г. Гусаков [и др.]; редкол.: В. Г. Гусаков (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларуская навука, 2017. – Ч. 1. – 310 с.; Ч. 2. – 508 с.

21. Інстытут гісторыі НАН Беларусі: навукова-інфармацыйнае выданне / уклад.: В. Л. Лакіза, Р. А. Аляхновіч; пад рэд. В. В. Даніловіча, В. Л. Лакізы. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – 60 с.

22. Калечыц, А. Г. Чалавек і асяроддзе: каменны век, Заходняе Палессе / А. Г. Калечыц. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – 584 с.

23. Криворот, А. А. Взаимодействие партизанских формирований Беларуси и Росии в тылу немецкой группы армий «Центр» /А. А. Криворот. – М.: Фонд «Историческая память», 2017. – 334 с.

24. Кривошей, Д. А. Судьбы народов Беларуси под оккупацией (июнь 1941 – июль 1944 г.) / Д. А. Кривошей. – М.: Фонд «Историческая память», 2017. – 316 с.

25. Лакиза, В. Археология на МКАД-2: дорога из прошлого в настоящее / В. Лакиза, А. Войтехович // Наука и инновации. – 2017. – № 9 (175). – С. 34–38.

26. Лакиза, В. Академическая археология Беларуси на современном этапе / В. Лакиза // Наука и инновации. – 2017. – № 9 (175). – С. 18–26.

27. Левко, О. Н. Кордон – новый памятник археологии эпохи викингов в Восточной Европе / О. Н. Левко // Докл. Нац. акад. наук Беларуси. – 2016. – Т. 60, № 5. – С. 120–127.

28. Левко, О. Н. Полоцкое княжество и Витебское Подвинье в эпоху викингов / О. Н. Левко // Наука и инновации. – 2016. – № 11. – С. 57–61.

29. Отчет о деятельности Национальной академии наук Беларуси в 2015 г. / Национальная академия наук Беларуси. – Минск, 2016. – 425 с.

30. Отчет о деятельности Национальной академии наук Беларуси в 2016 г. – Минск, 2017.

31. Славяне на территории Беларуси в догосударственный период: к 90-летию со дня рождения Леонида Давыдовича Поболя: в 2 кн. / О. Н. Левко [и др.]; науч. ред.: О. Н. Левко, В. Г. Белявец. – Минск: Беларуская навука, 2016. – Кн. 1. – 506 с.

32. Славяне на территории Беларуси в догосударственный период: к 90-летию со дня рождения Леонида Давыдовича Поболя: в 2 кн. / О. Н. Левко [и др.]; науч. ред.: О. Н. Левко, В. Г. Белявец. – Минск: Беларуская навука, 2016. – Кн. 2. – 410 с.

33. Смольянинов, М. М. Беларусь в Первой мировой войне 1914–1918 гг. / М. М. Смольянинов. – М.: Фонд «Историческая память», 2017. – 415 с.

34. Смяховіч, М. У. Сельская гаспадарка Беларусі ў 1943–1991 гадах: этапы развіцця, дасягненні, вопыт / М. У. Смяховіч; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – 439 с.

35. Чикалова, И. Р. Великобритания: изучение в Российской империи (XIX – начало XX в.) / И. Р. Чикалова. – СПб.: Алетейя, 2017. – 576 с.

36. Шаланда, А. І. Код Францішка Скарыны. Геральдычныя матэрыялы ў пражскіх і віленскіх выданнях беларускага першадрукара / А. І. Шаланда. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – 175 с.

37. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.]; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі; Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – 573 с.

38. Беларуская Народная Рэспубліка – крок да незалежнасці: да 100-годдзя абвяшчэння: гістарычны нарыс / А. А. Каваленя [і інш.]; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – 157 с.

39. Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus / Compilers are Vadim L. Lakiza, Rogneda A. Olehnovich; Edited by Vyacheslav V. Danilovich. – Minsk: Belaruskaya navuka Publ., 2018. – 60 p.

40. Belarus: pages of history / National Academy of Sciences of Belarus, Institute of History. – Minsk: Belaruskaya navuka Publ., 2018. – 408 p.

## References

1. Kavalenya A. A. (et al.) *Academic humanities: the most important results in 2016.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017. 188 p. (in Belarusian).

2. Kavalenya A. A. (et al.) *Academic humanities: the most important results in 2017.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ. 207 p. (in Belarusian).

3. Zhilinski M. G. (et al.) *Actual directions of ideological work in Belarus.* Minsk, Academy of Management under the President of the Republic of Belarus, 2017. 331 p. (in Russian).

4. Marfina O. V., Pomazanov N. N., Shipillo V. A., Krupplevsky V. S. *Anthropology of Belarus in the studies of the late XIX – mid XX century.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017. 456 p. (in Russian).

5. Borovskaya V. *Belarusian issue on the Soviet-Polish negotiations of 1918–1921.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017. 269 p. (in Belarusian).

6. Bukonkin D. A., Volod'kin A. A., Laikov K. M., Kavalenya A. A. (ed.) *Belarus in geopolitical processes of XX–XXI centuries: Collection of scientific articles.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017. 191 p. (in Russian).

7. Lyauko V. M., Danilovich V. V., Lakiza V. L., Kurlovich-Byalyaŭskaya P. S. *Belarus through the prism of regional history: Braslavski region: (to 950 anniversary of the city of Braslav): Collection of scientific articles.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2016. 271 p. (in Belarusian).

8. Skepyan A. A., Danilovich V. V., Lakiza V. L., Golubeu V. F., Dounar A. B. *Belarus in the light of regional history: Kalinkovichi and Kalinkovichi region: Collection of scientific articles.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2016. 325 p. (in Belarusian).

9. Danilovich V. V., Lyauko V. M. (et al.) *Belarus in the light of regional history: Shumilinski region: Collection of scientific articles.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2018. 263 p. (in Belarusian).

10. Kavalenya A. A., Anofranka N. V., Danilovich V. V., Zaval'nyuk U. M., Lakiza V. L., Novik N. Ya., Putsik U. S., Unuchak A. U. *Belarus, Slutsk edge and Edward Voynilovich. Materials of the International Scientific and Practical Conference.* Minsk, Medysont Publ., 2018. 416 p. (in Belarusian).

11. Zhilinski M. G. (et al.) *Belarusian way of development (questions and answers): directory.* Minsk, Academy of Management under the President of the Republic of Belarus, 2017. 184 p. (in Russian).

12. Belarus people's contribution to the Victory in World War II / A. M. Litvin [et al.]; editorial board: A. A. Kovalenya (editor-in-chief) [et al.]. Second ed. Minsk: Belarusian Science, 2016. - 495 p. (In Russian)

13. Volkov M. A. *Slutsk on old plans.* Minsk, Belarus' Publ., 2017. 159 p. (in Belarusian).

14. Skep'yan A. A., Gusakou U. R., Kavalenya A. A., Danilovich V. V., Lakiza V. L., Golubeu V. F., Lyauko V. M., Varonin V. A., Matsuk A. U. *The Grand Duchy of Lithuania: politics, economy, culture: Collection of scientific articles. Vol. 1.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017. 506 p. (in Belarusian).

15. Skep'yan A. A., Gusakou U. R., Kavalenya A. A., Danilovich V. V., Lakiza V. L., Golubeu V. F., Lyauko V. M., Varonin V. A., Matsuk A. U. *The Grand Duchy of Lithuania: politics, economy, culture: Collection of scientific articles.Vol. 2.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017. 498 p. (in Belarusian).

16. Nasevich V. L., Kuznyatsou G. I., Adamushka U. I., Kavalenya A. A., Yanouskaya V. V., Bandarenka K. M., Verzun M. A., Danilovich V. V., Kastsyuk M. P., Varachkina T. I. *Big Historical Atlas of Belarus. Vol. 3.* Minsk, Belkartagrafiya Publ., 2016. 352 p. (in Belarusian).

17. Voronin V. A., Skepyan A. A., Matsuk A. U., Kravchenko V. V. *History of Belarus, XVI–XVIII centuries: Research tutorial for 7th grade general secondary education institutions with the Belarusian language of instruction*. Minsk, Publishing Center of the Belarusian State University, 2017. 214 p. (in Belarusian).

18. Danilovich V. V., Lakiza V. L. Institute of History. *National Academy of Sciences of Belarus.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017, pp.189 –193 (in Russian).

19. Zyanyuk R. U. *College of the Roman Catholic Church in Belarus (1772–1914 biennium).* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017. 300 p. (in Belarusian).

20. Gusakov V. G., Gaponenko O. A., Danilovich V. V., Krivichanina E. A., Nosevich L. I., Smekhovich N. V., Kovalenya A. A., Tugai V. V. *History of agrarian science of Belarus (XIX–XXI centuries). Part 1-2.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017 (in Russian).

21. Lakiza V. L., Alyakhnovich R. A., Danilovich V. V. *History of agrarian science of Belarus (XIX–XXI centuries).* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2018. 60 p. (in Belarusian).

22. Kolechits A. G. *Man i environment: the Stone Age, Western Polesie*. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2018. 584 p. (in Belarusian).

23. Krivorot A. A. *Interaction of partisan formations of Belarus and Russia in the rear of the German army group «Center».* Moscow, Historical Memory Foundation, 2017. 334 p. (in Russian).

24. Krivoshei D. A. *The fate of the peoples of Belarus under the occupation (June 1941 – July 1944).* Moscow, Historical Memory Foundation, 2017. 316 p. (in Russian).

25. Lakiza V. Archeology at MKAD-2: the road from the past to the present. *Nauka i innovatsii = Science and Innovations*, 2017, no. 9 (175), pp. 34–38 (in Russian).

26. Lakiza V. Academic archeology of Belarus at the present stage. *Nauka i innovatsii = Science and Innovations*, 2017, no. 9 (175), pp. 18–26 (in Russian).

27. Levko O. N. Cordon – a new monument of Viking archeology in Eastern Europe. *Doklady Natsional'noi akademii nauk Belarusi = Doklady of the National Academy of Sciences of Belarus,* 2016, vol. 60, no. 5, pp. 120–127 (in Russian).

28. Levko O. N. The Polotsk Principality and the Vitebsk Oblast in the Age of the Vikings. *Nauka i innovatsii = Science and Innovations*, 2016, no. 11, pp. 57–61 (in Russian).

29. National Academy of Sciences of Belarus. *Report on the activities of the National Academy of Sciences of Belarus in 2015.* Minsk, 2016. 425 p. (in Russian).

30. National Academy of Sciences of Belarus. *Report on the activities of the National Academy of Sciences of Belarus in 2016.* Minsk, 2017 (in Russian).

31. Levko O. N. (et al.) *Slavs on the territory of Belarus in the pre-state period: to the 90th anniversary of the birth of Leonid Davydovich Pobol. Book. 1.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2016. 506 p. (in Russian).

32. Levko O. N. (et al.) *Slavs on the territory of Belarus in the pre-state period: to the 90th anniversary of the birth of Leonid Davydovich Pobol. Book. 2.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2016. 410 p. (in Russian).

33. Smolyaninov M. M. *Belarus in the First World War 1914–1918*. Moscow, Historical Memory Foundation, 2017. 415 p. (in Russian).

34. Smehovich M. V. *Agriculture Belarus in 1943–1991 years: the stages of development, achievement, expertise*. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017. 439 p. (in Belarusian).

35. Chikalova I. R. *Great Britain: study in the Russian Empire (XIX – early XX century).* St. Petersburg, Aleteiya Publ., 2017. 576 p. (in Russian).

36. Shalanda A. I. *Francisk Skorina Code. Heraldic materials in Prague and Vilna editions of the first Belarusian printer.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017. 175 p. (in Belarusian).

37. Social and political life in Belarus, 1772–1917. A. U. Unuchak [et al.]; editorial board: V. V. Danylovych (editor-in-chief) [et al.]. Nat. Acad. of Sciences, Institute of History. Minsk: Belaruskaya navuka Publ., 2018. 573 p.

38. Belarusian People's Republic – a step towards independence: to the 100th anniversary of the proclamation: historical sketch / A. A. Kovalenya [et al.]; the National Academy of Sciences, Institute of History. Minsk: Belaruskaya navuka Publ., 2018. 157 p.

39. Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus / Compiled by V. L. Lakiza, R. A. Olehnovich; Edited by V. V. Danilovich. Minsk: Belaruskaya navuka Publ., 2018. 60 p.

40. Belarus: pages of history / National Academy of Sciences of Belarus, Institute of History. Minsk: Belaruskaya navuka Publ., 2018. 408 p.

## Информация об авторах

**Данилович Вячеслав Викторович** – кандидат исторических наук, доцент, директор Института истории, Национальная академия наук Беларуси (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: danilovich_v@mail.ru

**Лакиза Вадим Леонидович** – кандидат исторических наук, доцент, заместитель директора по научной работе. Институт истории, Национальная академия наук Беларуси (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: lakvadim@yandex.ru

## Information about the authors

**Vyacheslav V. Danilovich** – Ph. D. (Hist.), Assistant Professor, Director of the Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Akademicheskaya Str., Minsk 220072, Belarus). E-mail: danilovich_v@mail.ru

**Vadzim L. Lakiza** – Ph. D. (Hist.), Assistant Professor, Deputy Director of the Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Akademicheskaya Str., Minsk 220072, Belarus). E-mail: lakvadim@yandex.ru